# СЛОВА – ПІСЬМЕННІКАМ-ЗЕМЛЯКАМ

**16 красавіка перад вучнямі сярэдняй школы № 38 г. Гродна, якая носіць імя асветніка Кірылы Тураўскага, выступілі гродзенскія пісьменнікі: член СПБ, паэт, публіцыст, літаратурны крытык Дзмітрый Радзівончык і малады паэт, празаік, драматург Андрэй Дарожкін. Асобнай старонкай сустрэчы стала тэма 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**





Госці правялі адразу два ўрокі сучаснай айчыннай літаратуры для вучняў адзінаццатых класаў. У пісьменнікаў была магчымасць убачыць, як сучасная айчынная літаратура прадстаўлена на старонках школьных падручнікаў для старэйшых класаў. Дзмітрый Мікалаевіч расказаў пра Саюз пісьменнікаў Беларусі, пра літаратурнае жыццё Прынёмання, запрасіў моладзь да супрацоўніцтва.

Затым госць прадставіў хлопцам і дзяўчатам свайго юнага калегу. Малады пісьменнік Андрэй Дарожкін, нягледзячы на свой узрост, ужо паспеў дабіцца пэўнай вядомасці ў літаратурным свеце Беларусі. Пералік яго ўзнагарод за перамогі і прызавыя месцы ў літаратурных конкурсах рознага ўзроўню заняў бы некалькі старонак. Творчы патэнцыял аўтара імкліва развіваецца. Публікацыі яго твораў паэзіі і прозы рэгулярна з'яўляюцца на старонках рэспубліканскіх перыядычных выданняў. У школьнікаў была магчымасць пазнаёміцца з нумарамі часопісаў «Нёман», «Полымя» і «Маладосць», дзе змешчаны творы Андрэя Дарожкіна. А яшчэ Андрэй сур'ёзна займаецца навукай, рыхтуецца абараніць кандыдатскую дысертацыю па культуралогіі.

Застаецца толькі пажадаць Андрэю Сяргеевічу моцнага здароўя, дастатковай колькасці энергіі і часу на ўсе яго справы.

Дзмітрый Радзівончык зрабіў прэзентацыю некаторых сваіх публікацый і кнігі «Песнярам Айчыны», калектыўнага зборніка літаратурных прысвячэнняў сучасных пісьменнікаў Гродзеншчыны вобразам класікаў беларускай літаратуры; прачытаў свае творы з гэтай кнігі, а таксама па просьбе гаспадароў прачытаў аўтарскі верш на рускай мове. Андрэй Дарожкін прачытаў свае вершы на розныя тэмы, як ужо апублікаваныя ў розных выданнях, так і зусім новыя.

Асобнай старонкай сустрэчы стала тэма 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Адбылася прэзентацыя тэматычнага зборніка літаратурна-мастацкіх твораў «Памяці вечны агонь». Андрэй Дарожкін прадэкламаваў свае вершы з гэтай кнігі. Пісьменнікі адказалі на пытанні аўдыторыі, падарылі кнігі на памяць, правялі фота- і аўтограф-сесіі.

Ініцыятарам сустрэч выступіла даўняя і добрая знаёмая гродзенскіх пісьменнікаў, настаўніца беларускай мовы і літаратуры СШ № 38 Жанна Антонаўна Івашкевіч. Педагог уручыла гасцям сяброўскія падарункі. Сустрэчы гродзенскіх літаратараў і юнакоў прайшлі ў абстаноўцы шчырай сімпатыі, зацікаўленасці і павагі. Таму можна не сумнявацца ў тым, што дыялог будзе працягвацца.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** член СПБ Дзмітрый Радзівончык і малады пісьменнік Андрэй Дарожкін у гасцях у старшакласнікаў Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 38 імя Кірылы Тураўскага г. Гродна». 16 красавіка 2025 года.










Памяти
ВЕЧНЫЙ ОГОНЬ











О Радзіма, табою напоўнена сэрца да краю,
І заўжды - ці працую, ці пільна на варце стаю,
Я твой велічны вобраз у думках сваіх уяўляю
І люблю, як жыцце, я зямлю маладую тваю!
Пімен Панчанка


Андрэй Макаёнак
Уладзімір Караткевіч
Іван Мележ
Максім Танк
Пімен Панчанка
Васіль Быкаў
Іван Шамякін
Іван Навуменка
Генадзь Бураўкін








ПЕСНЯРАМ
АЙЧЫНЫ










**Асобнай старонкай сустрэчы стала тэма 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.**




**Госці школы з ініцыятарам сустрэч, педагогам Жаннай Антонаўнай Івашкевіч**